# ТЫПЫ ФАЛЬКЛАРЫЗМУ Ў МАСТАЦКАЙ ТВОРЧАСЦІ

*Аляхновіч А.М.*

Агульнавядома, што аўтэнтычны фальклор існуе толькі у жывым бытаванні. Яго выкарыстанне ў іншых галінах культуры атрымала ў навуцы тэрмін «фальклярызм» [1, 406—407]. Ніжэй прапануецца тыпалогія фальклярызму ў мастацкай творчасці, якую аўтар не лічыць ідэальнай і канчатковай. Спадзяемся, што разглядаемая тыпалогія з'явіцца стымулам для далейшай тэарэтычнай распрацоўкі розных форм узнаўлення фальклорнай спадчыны, накіраваных на максімальнае захаванне фальклорнай першакрыніцы.

Даледуючы працэсы і метады ўзнаўлення фалькору, мы выдзяляем па ступені складанасці іх асваення сем тыпаў фальклярызму: 1) традыцыйны фальклор; 2) другасны фальклор; 3) апрацаваны фальклор; 4) аўтарскія творы, творы асобных калектываў якія прайшлі праз працэс фальклярызацыі; 5) стылізаваны фальклор; 6) рэстаўрыраваны фальклор; 7) рэканструяваны фальклор [2,41].

Традыцыйны фальклор прадстаўлены ў мастацкай творчасці непасрэднымі носьбітамі традыцыі. Гэта людзі сталэйшага і сярэдняга ўзросту, якія жывуць пераважна ў сельскай мясцовасці, памятаюць старадаўнія абрады і звычаі, песні, танцы, казкі і іншыя вусна-паэтычны творы, гульні і інш. Аўтэнтычны фальклор захоўваецца пераважна ў іх памяці. Яго перанясенне з натуральнага асяроддзя на сцэну заўсёды звязана са змяненнем, таму што сцэна мае свае законы выканання. Менавіта таму мы вызначаем гэты тып фальклярызму не як аўтэнтычны, а як традыцыйны.

Кожная веска, раён, вобласць рэспублікі маюць свае фальклорныя асаблівасці. Рэпертуар выканаўцаў традыцыйнага фальклору складаецца выключна з мясцовых песень. Ансамблі традыцыйнага фальклору ў сваей творчай рабоце імкнуцца максімальна дакладна перадаць народную песню. Іх выканаўчую манеру характэрызуе захаванне спецыфікі народнага спеву. Касцюмы ўдзельнікаў і іншыя фальклорныя атрыбуты тут заўсёды самабытныя, мясцовыя, старадаўнія. Гэты тып фальклярызму займае значнае месца ў мастацкай творчасці.

Другасны фальклор узнаўляецца звычайна маладымі людзьмі, якія не з'яўляюцца носьбітамі традыцый. Гэта студэнты, урачы, работнікі сферы адукацыі і культуры, свядомыя рабочыя і інш., якія не абыякава ставяцца да лёсу фальклорнай спадчыны, жадаюць узнаўляць яе так, як яна бытуе ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

народным асяроддзі. З гэтай мэтай яны наладжваюць экспедыцыі з мэтай запісу фальклорных твораў, вывучэння жыццёвага ўкладу людзей, пераймання майстэрства выканання ад народных майстроў. Маладзёжныя калектывы другаснага фальклору ствараюцца, як правіла, у гарадах і раённых цэнтрах.

Асноўны напрамак дзейнасці ўдзельнікаў другаснага фальклору заключаецца ў імкненні вывучаць комплексна фальлор і ўключаць у свае праграмы песенную, інструментальную, харэаграфічную народную творчасць. Асваенне фальклорнай спадчыны патрабуе ад моладзі навуковых метадаў пазнання рэчаіснасці, ведаў у галіне гісторыі народнага мастацтва і выканальніцтва.

Другасны фальклор як тып фальклярызму — важная форма асваення песенных традыцый. Значэнне яго цяжка пераацаніць у адносінах да перспектывы іх захаванасці і развіцця ў сучасных умовах.

Апрацаваны фальклор выконваецца рознымі фальклорнымі калектывамі, ансамблямі, асобнымі выканаўцамі, народнымі хорамі. Ён прадстаўлены выканаўцамі рознага ўзросту, адукацыі, сувяззю з фальклорнай традыцыяй. Звычайна фальклор у іх выкананні выступае ў апрацаваным выглядзе. Але не ўсе творы могуць апрацоўвацца. Напрыклад, абрадавыя песні неабходна выконваць без апрацоўкі, таму што яны гучаць у вузкіх інтэрвалах (тэрцыі, кварты, квінты), выконваюць у абрадах падпарадкавальную функцыю. Не ўсе апрацоўкі захоўваюць арыгінал. Асабліва спрэчным з'яўляюцца некаторыя апрацоўкі для народных хораў якія спяваюць у агульнаеўрапейскай ці рускай манеры выканання. Карыфей беларускага фальклору Г. І. Цітовіч адзначаў, што ў некаторых апрацоўках«... і «паху» народнай песні не застаецца» [3,62].

Такім чынам, сутнасць апрацоўкі павінна вызначацца беражлівымі адносінамі да арыгінала, імкненнем захаваць стылявыя асаблівасці фальклорнага твора, падкрэсліць самабытнасць фальклорнай песні.

Аўтарскія творы, творы асобных калектываў. Тэты тып фальклярызму прадстаўлены творамі, якія бытуюць у народным асяроддзі, набылі вары- янты, сталі «роднымі» ў жывым бытаванні, фальклярызаваліся, лічацца народнымі. Дзякуючы сродкам масавых камунікацый, лепшыя аўтарскія творы пападаюць ў жывое бытаванне і становяцца фальклорнымі. Напрыклад, папулярнасць песні «Бывайце здаровы» ў народзе была настолькі вялікай «... што нават прафесіянальныя крытыкі і музыказнаўцы не маглі «прымірыцца» з устанаўленнем аўтара» [4,89].

Лепшыя аўтарскія творы выкарыстоўваюць змест, паэтычную вобразнасць і структуру, характэрныя для народнай традыцыі. Многія песні

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

з'явіліся ў выніку калектыўных пошукаў, шляхам распеву ў калектывах першапачатковай мелодыі, прапанаванай адным з яго ўдзельнікаў. Любімыя народам аўтарскія песні становяцца з цягам часу вядомымі па ўсёй краіне, атрымліваюць далейшае развіццё ў новых варыянтах.

Стылізаваны фальклор. Неабходна адзначыць, што тэрмін «стылізацыя» ў адносінах да мастацкай творчасці трактуецца па-рознаму. Да таго ж некаторыя вучоныя і практыкі ставяцца да стылізацыі адмоўна. Такі пункт гледжання да стылізаванага фальклору правамерны ў многіх выпадках, паколькі часам скажаецца самая сутнасць фальклору. Няўдалыя стылізацыі выступаюць як надуманае, механічнае спалучэнне фальклорных элементаў без агульнага сюжэта і задумы. Стылізацыя як тып фальклярызму пад сілу толькі высокакваліфікаваным кіраўнікам і выканаўцам. Тэрмін «стылізацыя» ў літаратуразнаўстве і музыказнаўстве трактуецца як аднаўленне, узнаўленне істотных рыс стылю пісьменніка, мастацкага напрамку, літаратурнай плыні, спецыфічных асаблівасцей музыкі. Фальклорныя стылізацыі не ўкладваюцца ў межы якога-небудзь аднаго з іх, таму што фальклорны стыль уключае выяўленчыя сродкі мовы, музыкі, пластыкі... [5,7].

Можна зрабіць выснову, што стылізацыя фальклору ў мастацкай дзейнасці азначае ўзнаўленне фальклорных жанраў у арганічным адзінстве з абрадам, этнаграфічным асяроддзем.

Рэстаўрыраваны фальклор. Рэстаўрацыя азначае аднаўленне фальклору ў першапачатковым выглядзе, дзякуючы захаванасці яго ў памяці людзей старэйшага пакалення. Гэта — жывая памяць пакаленняў, якая дазваляе адрадзіць многія старадаўнія фальклорныя творы. Менавіта так многія выканаўцы ў апошнія гады асвойваюць фальклорную спадчыну.

Звычайна ў гэтым тыпе фальклярызму ажыццяўляюць вялікую падрыхтоўчую работу: знаходзяць асобныя песенныя тэксты, рэшткі напеваў, па расказах знаўцаў фіксуюць абставіны выканання фальклорных твораў, узнаўляюць этнаграфічнае асяроддзе, касцюмы і інш. Гэту падрыхтоўчую работу па рэстаўрацыі фальклору можна параўнаць у пэўнай ступені з дзейнасцю даследчыка.

Рэканструяваны фальклор. Рэканструкцыя фальклору ажыццяўляецца на аснове даных аб яго мастацкіх, эстэтычных, стылістычных уласцівасцях і функцыянальным прызначэнні. Даныя можна атрымаць пры вывучэнні друкаваных прац па гісторыі культуры, этнаграфіі, фальклорнай творчасці, у гутарках са знаўцамі і носьбітамі традыцый, пры знаёмстве з творамі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Акрамя таго, закладзена пэўная інфармацыя ўжо ў самім тэксце.

Размова ідзе аб фальклору, які знік са штодзённага побыту. Тэта найболыш складаны тып фалькларызму, таму што патрабуе ад кіраўніка і ўдзельнікаў універсальных ведаў у розных галінах навукі і мастацтваў. Бліскучым прыкладам дзейнасці ў гэтым накірунку з'яўляецца творчасць заслужанага аматарскага фальклорнага ансамбля «Крупіцкія музыкі» (стваральнік У.М. Гром). У калектыве рэстаўрыраваны альбо рэканструяваны дзесяткі забытых фальклорных інструментаў: дудка, карына, ліра, парныя дудкі, гудок, сурма, «салавей», дуда, розныя ударна-шумавыя і інш.

Аўтар усведамляе, што прадстаўленая тыпалогія фальклярызму не ахоплівае шматлікія жанры мастацтва, у якіх выкарыстоўваецца фальклор, і спадзяецца на яе далейшую распрацоўку.

**Літаратура**


1. Гусев В. Е. Фольклоризм//Восточнославянский фольклор. Словарь научной и народной терминологии. Мн., 1994;
2. Аляхновіч А. М. Народная песня ў мастацкай самадзейнасці. Мн., 1991;
3. Песня: любоў і абавязак. Інтэрв'ю з народным артыстам СССР Г. І. Цітовічам//Мастацтва Беларусі. 1985, № 8;
4. Цішчанка І. К. Жыццё песні: гісторыя ўзнікнення і бытавання «Бывайце зда- ровы»//Беларуская фалькларыстыка. Мн., 1980;
5. Гусев В.Е. О понятии «фольклорная стилистика»//Поэтика искусства слова. Воронеж, 1978.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ